✓З **1 верасня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіць тэматычная выстава **«У нагу з часам: сучаснасць і будучыня бібліятэкі ў лічбавую эпоху»**. У лічбавую эпоху значэнне інфармацыйнай культуры імкліва павялічваецца, і на бібліятэку ўскладаецца павышаная адказнасць за фармаванне навыкаў правільнага фармулявання пошукавых запытаў, арыентавання ў самых разнастайных інфармацыйных рэсурсах. Невымерна ўзрастае роля адбору і ацэнкі дакладнасці сеткавай інфармацыі. У бібліятэках ужо ажыццяўляецца алічбоўка культурнай спадчыны, фармуюцца электронныя базы дадзеных, ствараюцца інфармацыйныя парталы, віртуальныя выставы. Тэмы развіцця рынку новых бібліятэчных тэхналогіяў (распрацоўка мабільных праграмаў, рабатызацыя, стварэнне вэб-архіваў, чат-камунікацыі і інш.) знайшлі адлюстраванне ў артыкулах разнастайных перыядычных выданняў. Экспазіцыя выставы налічвае блізу сарака часопісаў і газет Беларусі, з якімі можна пазнаёміцца па 27 кастрычніка.